**Літвіноўская А. Г. (Мінск)**

# ДАПАМОЖНІК “20 КРОКАЎ ДА БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ”: ЯК ВУЧЫЦЬ РОДНУЮ МОВУ НАНОВА (АЎТАРСКІ ПАДЫХОД)

Бясплатныя курсы беларускай мовы для дарослых “Мова Нанова” існуюць са студзеня 2014 года і былі запачаткаваныя ў Мінску журналістам Глебам Лабадзенкам і філолагам Алесяй Літвіноўскай. Пазней курсы адкрыліся таксама ў Астраўцы, Бабруйску, Баранавічах, Брэсце, Віцебску, Гродна, Гомелі, Магілёве, Маладзечна і Светлагорску. Штотыдзень у нашай краіне курсы наведвае каля 650 студэнтаў. Ад кастрычніка 2014 года выдадзена больш за 1900 студэнцкіх білетаў. Дарэчы, за межамі Беларусі курсы сёння дзейнічаюць у Таронта, Лімерыку, Стакгольме, Варшаве і Берліне.

Назва курсаў тлумачыцца проста. Многія беларусы кажуць, што беларуская – іх родная мова. Пры гэтым не зусім добра ці зусім нядобра ведаюць яе. Гэта словазлучэнне – “родная мова” – вельмі часта ўводзіць у зман нас саміх. Варта прызнацца, што беларусам прыйшоў час вучыць беларускую мову нанова. Такія прыклады – калі народ адраджаў паўзабытую мову – ёсць у гісторыі, і яны натхняюць!

За час існавання курсаў адбылося ўжо больш за 110 урокаў, прысвечаных розным лексічным і граматычным тэмам, якія можна знайсці на сайце www.movananova.by. З мэтай зрабіць інфармацыю, распрацаваную на курсах, даступнай для больш шырокага кола беларусаў, было вырашана распачаць выданне серыі кніг “Мова Нанова: 20 крокаў да беларускай мовы”.

Першая кніга серыі пабачыла свет сёлета ўвесну ў выдавецтве “Медыял”. Дапаможнік перадусім адрасуецца беларусам, якія раней вывучалі беларускую мову, але сёння валодаюць ёй пасіўна, не ўжываюць у штодзённым жыцці, часта не маюць беларускамоўнага асяроддзя, аднак хочуць аднавіць свае веды мовы і пабароць комплекс “трасянкамоўнасці”, які не дазваляе пачынаць гаварыць публічна па-беларуску праз адсутнасць упэўненасці ў чысціні свайго маўлення.

Побач з адукацыйнай задачай дапаможнік ставіць задачу папулярызацыі беларускай мовы, якая сёння, на жаль, у сілу шэрагу аб’ектыўных прычынаў з’яўляецца мовай нізкага прэстыжу. Нашу мову працягваюць пераследаваць шматлікія стэрэатыпы. Маўляў, беларуская – гэта мова калгаснікаў”, бо “гарадскія” гавораць па-руску. Або мова апазіцыі, гэта значыць, што калі ты гаворыш па-беларуску, ты напэўна з БНФ. Добра, што гэтыя стэрэатыпы цяпер ужо адыходзяць у нябыт. Але сёння часта даводзіцца чуць, што беларуская – гэта мова гуманітарыяў, таму калі пісьменнікі і журналісты, мастакі і краязнаўцы гавораць па-беларуску – гэта “нармальна”, ім нібыта можна і нават больш за тое - трэба. Аднак наша мэта – паказаць, што беларуская – мова для ўсіх, незалежна ад сферы дзейнасці, сацыяльнага статусу, узросту і гендарнай прыналежнасці. Кожны ў нашай кнізе знойдзе для сябе нешта цікавае і карыснае.

“Мова Нанова: 20 крокаў да роднай мовы” – дапаможнік перадусім не акадэмічны, ён адлюстроўвае аўтарскі падыход да выкладання мовы, які паказаў сваю эфектыўнасць на “жывых” курсах цягам некалькіх год. У нечым пазіцыя аўтараў адносна ўжывання таго ці іншага слова можа не супадаць з пазіцыяй афіцыйных слоўнікаў, якія ў сілу сваёй кансерватыўнай прыроды часта фіксуюць папярэдні стан мовы, не адлюстроўваючы актуальны ўзус. Аднак лексіка як найбольш дынамічная моўная сістэма развіваецца, жыве, змяняецца дастаткова дынамічна, асабліва ў апошнія гады, калі моладзь зноў пачынае актыўна карыстацца беларускай мовай. Гэты працэс, на нашу думку, патрабуе ўвагі з боку мовазнаўцаў. І гэта тое, што мы як аўтары пастараліся зафіксаваць у нашым выданні. Таму вы знойдзеце не толькі *майку*, але таксама *саколку* і *цішотку*; не толькі *халадзільнік*, але і *лядоўню*, не толькі *ручку*, але і *асадку*, не толькі *інтэрнэт*, але і *сеціва*. Мы прадбачым крытыку з боку некаторых лінгвістаў, але сцвярджаем, што калі сучасныя беларусы актыўна выкарыстоўваюць у сваім вусным і пісьмовым маўленні (напрыклад, у сацыяльных сетках, на форумах) такія словы, мы не можам і не мусім іх ігнараваць. Бо ў нармальнай, жывой мове няспынна адбываецца натуральны працэс словатворчасці, запазычвання, пераасэнсавання, які мы назіраем сёння і ў нас. Можна безліч разоў казаць, напрыклад, што слова *вышыванка*

не беларускае, а ўкраінаскае, што яно непатрэбнае нашай мове, што мы маем сваё - *адзенне з вышыўкай, арнамент*. Аднак на сёння яго ведае і пазнае кожны, яно моднае і папулярнае, яно ўжо заняла ў беларускай мове сваё месца.

Дапаможнік складаецца з 20-ці крокаў (урокаў). Кожны ўрок атрымаў назву паводле лексічнай тэмы, сярод якіх "Вітанні і звароты", "Каляндар", "Кватэра", "Часткі цела і органы", "Сваякі", "Адзенне", "Адукацыя", "Крама" і нават "Лаянка". Адпаведна, першая частка кожнага кроку – слоўнічак на тэму з прыкладамі. Напрыклад, з кроку "Кампутар і інтэрнэт": **Змесціва** / **кантэнт** (рус. содержание). *Змесціва флэшкі падалося Марце дзіўным, і яна зразумела, што ўхапіла ва ўніверсітэце чужы носьбіт інфармацыі.* Як мы ўжо адзначылі вышэй, у слоўніку падаюцца не толькі словы, зафіксаваныя нарматыўнымі слоўнікамі беларускай мовы, але таксама і неалагізмы, новыя запазычанні ды слэнгавыя варыянты. Аднак арыентацыя на сучасныя моўныя рэсурсы ні ў якім выпадку не адмяняе ўвагі да традыцыйнай лексікі, трапных і сакавітых словаў народнай мовы, як гэта бачна ў кроку "Лаянака", які знаёміць чытачоў з арыгінальнай беларускай лаянкавай лексікай, у тым ліку запісанай фальклярыстам Міхалам Федароўскім. Мы падкрэсліваем, што, вывучаючы новае, не варта забывацца на багаты і разнастайны пласт народнай экспрэсіўнай лексікі.

Другая частка кожнага кроку, "Тэорыя і практыка мовы", утрымлівае граматычную (у шырокім сэнсе слова) тэму: "Клічныя формы назоўнікаў", "Колькасныя лічэбнікі", "Іллжэсябры перакладчыка", "Скланенне назоўнікаў жаночага роду на *-а/-я*", "Прыналежныя прыметнікі", "Падаўжэнне", "Эўфемізмы", "Назвы беларускіх гарадоў, мястэчак і вёсак" і інш. Акрамя тэмаў сучаснай беларускай мовы, пэўная ўвага таксама надаецца пытанням гісторыі мовы ў раздзелах "Беларуская лацінка", "Дарэформавы правапіс vs парэформавы правапіс". Іншымі словамі, тым тэмам, якія выклікалі найбольшы інтарэс у слухачоў курсаў "Мова Нанова" і дапамагаюць засвоіць унікальныя фанетычныя, марфалагічныя, лексічныя і іншыя адметнасці беларускай мовы. Пры іх тлумачэнні робіцца ўхіл перадусім у функцыянальную граматыку. Усе тэмы суправаджаюцца граматычнымі заданнямі, ключы да якіх таксама падаюцца ў кнізе. Такім чынам, кожны, хто жадае, можа не толькі паўтарыць ці глыбей вывучыць тую ці іншую граматычную тэму, але і замацаваць атрыманыя веды.

Бадай, самы разнастайны і ў пэўным сэнсе забаўляльны раздзел кожнага кроку – "Цікавінкі". У залежнасці ад лексічнай і граматычнай тэмы кроку ў ім падаюцца розныя актуальныя матэрыялы. Так, напрыклад, да тэмы "Вітанні і зароты" прыводзіцца "Маленькі слоўнічак беларускіх народных імёнаў", а таксама дзіцячыя вершыкі Алены Церашковай, прысвечаныя розным беларускім імёнам. У тэме "Каляндар" падаюцца беларускія прымаўкі і прыказкі пра месяцы. Унікальныя фотаздымкі інтэр'ераў Нясвіжскага замка можна пабачыць у кроку "Кватэра". З "Адукацыі" можна даведацца пра самыя старыя навучальныя ўстановы Беларусі, а таксама

пазнаёміцца з асноўнымі фактамі пра Балонскі працэс. У кроку “Медыцына” вы знойдзеце сканы артыкулаў з “Нашай Нівы” пачатку стагоддзя. 10 беларускіх перамог апісваюцца ў кроку “Войска”. А ў кроку “Тэатр” прыводзіцца топ 15 фактаў з гісторыі беларускага тэатра. Там жа падаецца і гумарыстычны “Гэнтымалагічны (псеўдаэтымалагічны) слоўнічак беларускай мовы”, складзены супольна са слухачамі курсаў “Мова Нанова” ў Мінску.

Кожны крок таксама мае невялічкую рубрыку “Правер сябе”, у якую ўваходзіць 5 пытанняў па выкладзеных у ім лексічных і граматычных тэмах.

Акрамя таго, напрыканцы кнігі ёсць каляровы дадатак, у якім размешчаны фотаздымкі з заняткаў на курсах “Мова Нанова” ў розных гарадах краіны. Выданне таксама багата ілюстраванае адмыслова створанымі для кожнага раздзела малюнкамі, што робіць яго прывабным для чытача.

Такім чынам, у кнізе кожны неабыякавы да беларускай мовы чалавек знойдзе патрэбную для сябе інфармацыю ў галіне лексікі, граматыкі, гісторыі мовы, а таксама беларускай культуры і гісторыі Беларусі і, галоўнае, пераканаецца ў тым, што наша мова прыгожая, багатая і прыдатная для таго, каб выкарыстоўваць яе ва ўсіх магчымых сферах сучаснага жыцця.

Цяпер да друку рыхтуецца другая кніга з серыі “Мова Нанова: 20 крокаў да беларускай мовы”, у якую ўвойдуць урокі “Цырульня”, “Мастацтва”, “Рыбалка”, “Экалогія”, “Надвор’е”, “Якасці людзей”, “Тэлебачанне” і іншыя. Адметнасцю наступнага выдання будзе наяўнасць у ім трох урокаў, прысвечаных класікам беларускай літаратуры: Якубу Коласу, Васілю Быкаву і Рыгору Барадуліну.